# РЭФЕРАТ

Справаздача 43 с., 1 ч., 70 крыніц

АФАРЫЗМ, ІДЫЯМАТЫКА, МІКРАТЭКСТ, МАЎЛЕНЧА-КАМУНІКАЦЫЙНАЯ АДЗІНКА, ІНСТЫТУЦЫЯНАЛЬНАЯ ЛІНГВІСТЫКА, ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛОГІЯ, ФІГУРАЛЬНЫ І ЛІТАРАЛЬНЫ СЭНС, ТЭКСТАЎТВАРАЛЬНАЯ РОЛЯ АФАРЫЗМА

Аб’ект вывучэння – беларуская афарыстыка як нацыянальна-культурны феномен.

Прадметам даследавання з’явіліся беларускія афарыстычныя выслоўі, іх лінгвапрагматычнае апісанне і сістэматызацыя.

Метады даследавання: лінгвістычнае назіранне і абагульненне, стылістычны разбор, элементы семантычнага і супастаўляльна-параўнальнага аналізу.

Характарыстыка працы: вызначана, што беларускі афарызм уваходзіць у сістэму беларускай ідыяматыкі як адзін з відаў выслоўяў, што з’яўляюцца аўтарскімі мікратэкстамі і маюць нацыянальна-спецыфічны характар па зместу і форме, бо захоўваюць інфармацыю пра сістэму духоўных каштоўнасцей людзей, аб’яднаных адзінай культурай; выяўлена, што афарызмы ўтвараюць афарыстычны дыскурс – асаблівы падвід быційнага дыскурса, кампаненты якога характарызуюцца жанравай спецыфікай, пэўнай тэматычнай аднесенасцю, а таксама функцыянальна-прагматычнымі асаблівасцямі.

Ступень укаранення: вынікі даследавання укаранены ў адукацыйны працэс вну, што пацверджана аб’ёмам публікацый (59) як асобай формы ўкаранення вынікаў.

Галіна прымянення: школы, вну, інстытуты развіцця адукацыі.

Навуковая і практычная значнасць. Атрыманыя вынікі НДП «Беларуская афарыстыка як нацыянальна-культурны феномен» з’яўляюцца новымі. Упершыню афарызм не аналізуецца як фармальна-граматычны элемент мовы, а разглядаецца ў якасці маўленчай адзінкі, якая з’яўляецца інстытуцыянальным складнікам тэксту і выяўляе культуралагічную кампетэнцыю носьбітаў мовы.